Аўтар: Кінга Красіцкая
23.08.2015 01:00

Салідарныя з хрысціянамі
Блізкага Усходу

У многіх касцёлах Еўропы звон званоў нагадаў пра праследаванне хрысціян на Блізкім Усходзе.

Ідэя гэтага простага жэста салідарнасці нарадзілася на Поўдні Францыі. У хуткім часе да ініцыятывы далучылася больш за 50 французскіх дыяцэзій, усе дыяцэзіі Бельгіі, а таксама Люксембург, Ісландыя і адна швейцарская дыяцэзія. У многіх касцёлах загучалі не толькі званы, але і спецыяльныя малітвы за братоў і сясцёр, што перажываюць праследаванні. Акрамя гэтага, французскае Міністэрства замежных спраў абвясціла аб правядзенні ў Парыжы вялікай міжнароднай канферэнцыі на тэму хрысціян і іншых праследуемых этнічных і рэлігійных меншасцей у Іраку і Сірыі. Удзел у ёй прыме 60 краін. †

“Перамажы абыякавасць,
выйграй супакой”

Так гучыць тэма 49-га Сусветнага дня супакою, выбраная папам Францішкам. Гэты дзень будзе адзначацца ў каталіцкім Касцёле 1 студзеня 2016 г.

Паведамленне прэс-службы Апостальскай Сталіцы падкрэслівае, што “абыякавасць да бед нашага часу з’яўляецца адной з галоўных прычын адсутнасці супакою ў свеце”. “Больш інфармацыі” не азначае “больш увагі” да праблем, калі гэта не суправаджаецца адкрыццём сумленняў на салідарнасць.

Сусветны дзень супакою з’яўляецца ініцыятывай бл. Паўла VI. Ён адзначаецца ў першы дзень года. Папскае пасланне, што выдаецца з гэтай нагоды, рассылаецца кіраўнікам усяго свету. Яно таксама акрэслівае лінію дзейнасці дыпламатыі Апостальскай Сталіцы ў дадзеным годзе.

Аўтар: Кінга Красіцкая
23.08.2015 01:00

